**Вусны часопіс «Дарога да святыняў друкаванага слова»**
(да Дня беларускага пісьменства)

**МЭТА:**

- паглыбіць веды вучняў пра гісторыю беларускага пісьменства і друку;
- развіваць уважлівасць, кемлівасць, уменне сцісла і лаканічна выказваць свае думкі;
- стварыць умовы для выхавання ў вучняў цікавасці да гісторыі роднага краю.

**Форма правядзення:** гульня ”Поле цудаў”
**Абсталяванне:** партрэты Францыска Скарыны, Еўфрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага; барабан.

**Ход мерапрыемства**

Настаўнік.

Добры дзень, паважаныя сябры! Штогод у першую нядзелю верасня ў нашай краіне адзначаецца нацыянальнае свята — Дзень беларускага пісьменства, якое для ўсіх нас мае вялікае значэнне.

Ідэя свята заключаецца ў тым, каб паказаць цесную сувязь беларускага друкаванага слова з яго славянскімі вытокамі, з гісторыяй беларускага народа.

Як правіла, гэтае свята праводзіцца ў гарадах з багатай гістарычнай і культурнай спадчынай, старадаўніх цэнтрах асветы і кнігадрукавання.

Свята тройчы прымаў Полацк (1994, 2003, 2017), двойчы — Тураў (1995, 2004), а таксама Заслаўе (2000, 2014);

Навагрудак (1996), Нясвіж (1997), Орша (1998), Пінск (1999), Мір (2002), Камянец (2005), Паставы (2006), Барысаў (2008), Смаргонь (2009), Хойнікі (2010), Ганцавічы (2011), Глыбокае (2012), Шчучын (2015), Рагачоў (2016), Іванава (2018), Слонім (2019), Бялынічы (2020), Капыль (2021),

У 2023 годзе юбілейны XXX Дзень беларускага пісьменства будзе прымаць паўночны рэгіён нашай краіны – Віцебская вобласць. Свята адбудзецца ў раённым цэнтры Гарадок.

Зараз я прапаную вам здзейсніць зовочнае падарожжа ў гэты горад і даведацца пра яго гісторыю і традыцыі.

*Выступленні вучняў*

Невялікі Гарадок, які раскінуўся на берагах ракі Гараджанка і возера Лугавое, прыцягвае ўвагу сваімі яркімі старонкамі гісторыі, старажытнымі традыцыямі і гістарычнымі славутасцямі.

Гісторыя Гарадка, які ўзнік на месцы старажытнага ўмацаванага

паселішча, сыходзіць сваімі каранямі ў XII стагоддзе. Першае пісьмовае згадванне ў летапісах аб гэтым невялікім селішчы адносіцца да 1128 года ў сувязі з ваенным паходам кіеўскага князя Мсціслава Уладзіміравіча на землі Полацка.

Спрадвеку Гарадок быў рамесніцкім, а затым – прамысловым мястэчкам. Мясцовыя жыхары былі вялікімі майстрамі ў ганчарным рамястве. Найбольшае развіццё гэты промысел атрымаў у XIX – першай палове XX стагоддзя, калі ў мястэчку сталі стварацца ганчарныя арцелі, пазней пераўтвораныя ў цэхі, якія мясцовыя жыхары называлі проста «ганчаркай». Гарадоцкая кераміка адрознівалася прастатой і пластычнасцю формаў і светлым тэракотавым колерам з адценнямі фіялетавага і карычневага. У асноўным майстры выраблялі керамічныя вырабы гаспадарчага прызначэння – гаршкі, збаны, глякі, гладышы, міскі, якія сёння, нажаль, выйшлі з ужытку на сучаснай кухні. У прамысловых маштабах гарадоцкая кераміка больш не вырабляецца, але ганчарнае кола круціцца ў мясцовым доме рамёстваў. Характэрна, што старое рамяство ў сучасным Гарадку адрадзілі ганчары-жанчыны.

Славіцца Гарадок і сваёй нематэрыяльнай культурай. Так, мясцовае ткацтва «Кісея» ўнесена ў дзяржаўны спіс нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны краіны. А паглядзець узоры абрусаў і ручнікоў, выкананых у мясцовай манеры, можна ў раённым краязнаўчым музеі і Гарадоцкім доме рамёстваў.

*Прагляд відэароліка*

Вядомы Гарадок і сваім абрадам «Пахаванне дзеда», які праводзіцца ў першы дзень Масленіцы і сімвалізуе сабой праводзіны зімы. Так, калі ў іншых частках Беларусі спальваецца пудзіла, то ў Гарадку адбываецца «пахаванне» лялькі ў натуральную велічыню. Так тут прынята сустракаць пачатак вясны. Гарадоцкія майстры таксама адрадзілі батлейку з сезоннымі спектаклямі ў рэпертуары. Батлеечная шафа, лялечныя персанажы і дэкарацыі ствараліся згодна з мясцовым фальклорным традыцыям. Сярод архітэктурных славутасцяў горада неабходна назваць будынкі паштовых станцый сярэдзіны XIX стагоддзя, якія захаваліся ў Гарадку і яго наваколлях яшчэ з часоў Расійскай імперыі. З таго часу таксама захаваўся вадзяны млын і застаўны дом. Акрамя таго, Гарадок можа пахваліцца захаванай гістарычнай гарадской забудовай канца XIX – пачатку XX стагоддзя: гандлёвымі і жылымі дамамі. Візітнай карткай горада з’яўляецца Свята-Троіцкая царква, перабудаваная ў канцы XX стагоддзя з будынка былой царкоўна-прыходскай школы. У лік рэлігійных славутасцяў горада ўваходзіцы Благавешчанскі касцёл, таксама пабудаваны ў канцы XX стагоддзя. Ёсць у горадзе і камяні-валуны, устаноўленыя

ў памяць беларускага паэта Канстанціна Вераніцына – аўтара знакамітага «Тараса на Парнасе». Верагоднае аўтарства самага папулярнага ў XIX стагоддзі беларускага твора, які доўгі час насіў статус ананімнага, прыпісваюць ураджэнцу тутэйшых мясцін Канстанціну Вераніцыну, аднаму з заснавальнікаў новай беларускай літаратуры. І хаця нарадзіўся ён у Астраўлянах, паэму ў 1855 годзе пісаў у Гарадку, дзе вучыўся ў прыходскім вучылішчы. Калі вы яшчэ не чыталі гэтую сатырычна-гумарыстычную паэму, то варта сумясціць яе прачытанне з паездкай у Гарадок на свята народнай творчасці, беларускай паэзіі і фальклору «Гарадоцкі Парнас». На штогадовым мерапрыемстве з нагоды аўтара і яго твора ў Гарадку збіраюцца аматары літаратуры і паэзіі. Для гасцей арганізуюць аўтобусную экскурсію па «вераніцынскіх» месцах і велапрабег для жадаючых «Сцежкамі Тараса», працягласцю каля 40 кіламетраў.

Галоўная мясцовая прыродная славутасць – урочышча «Вараб'ёвы горы» на ўскраіне Гарадка. Тут можна пракаціцца па гарадоцкай лыжаролернай трасе, наведаць рэзідэнцыю Снягуркі на востраве паміж азёрамі Лугавое і Арэхавае і проста адпачыць на ўлонні прыгожай прыроды. Сасновае паветра, узгорыстая мясцовасць і азёрная празрыстая вада – прывабны варыянт летняга адпачынку.

Гульня «Поле цудаў"

1 тур

Г У Т Э Н Б Е Р Г

Заданне: прозвішча першаадкрывальніка друкарскай справы ў Заходняй Еўропе, які каля 1445 г. вынайшаў друкарскі станок і заснаваў друкарню ў Майнцы (Германія).

**2 тур**

*А П О С Т А Л*

Заданне: назва кнігі Ф. Скарыны, якую ён надрукаваў у сталіцы ВКЛ Вільні ў 1525 г.

**3 тур**

П Р А Г А

Заданне: назва горада, у якім у **1517 г. Ф. Скарына** распачаў актыўную выдавецкую дзейнасць.

**ФІНАЛ**

З А Л А Т А В У С Т (10)

Заданне: як народ празваў Кірылу Тураўскага за красамоўства.

**СУПЕРГУЛЬНЯ**

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | *П* | | | | | |
| | | *Е* | | | | | |
| | | *Р* | | | | | |
| | | *Г* | | | | | |
| *С* | *К* | *А* | *Р* | *Ы* | *Н* | *А* | |
| | | *М* | | | | | |
| | *Л* | *Е* | *Т* | *А* | *П* | *І* | *С* |
| | | *Н* | | | | | |
| | | *Т* | | | | | |

Заданні:

1. (па вертыкалі) матэрыял для рукапісных кніг, спецыяльна вырабленая скура цялят;
2. (па гарызанталі) прозвішча беларускага першадрукара;
3. (па гарызанталі) *жанр літаратуры,* запіс падзей па гадах у храналагічнай паслядоўнасці.

Падвядзенне вынікаў.

Узнагароджванне пераможцаў.

Заключнае слова настаўніка.

За сваю шматгадовую гісторыю Дзень беларускага пісьменства стаў па-сапраўднаму нацыянальным святам, значнай падзеяй культурнага жыцця краіны.

Невыпадкова тое, што ён праводзіцца ў першыя дні новага навучальнага года. Адукацыя, інфармацыя і культура - тры галіны, якія фарміруюць інтэлектуальную эліту нацыі, яе сучаснасць і будучыню.

У гэты дзень мы аддаём даніну павагі нашым продкам, якія стварылі фундамент беларускай адукацыі і пісьменства.